Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

4 СТУДЗЕНЯ 2007 г.
ЧАЦВЕР
№ 1 (25866)
Кошт 350 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Наша газета ўключана ў «Залаты фонд прэсы» СНД

Дапамогі з новай «кропкі адліку»

З 1 студзеня памер штомесячнай дапамогі на дзяцей ва ўзросце больш за 3 гады складае 50 880 рублёў — аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведаміла намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна ШЭМЕТАВЕЦ.

Пры гэтым самі ўмовы прадастаўлення дапамог на дзяцей ва ўзросце больш за 3 гады застаюцца ранейшымі. У якасці першай з іх вызначана работа бацькоў. А другой — памер даходаў. Так, нагадала Таццяна Шэметавец, дапамога на дзяцей ва ўзросце больш за 3 гады прызначаецца і выплачваецца ў поўным памеры (50 880 рублёў), калі штомесячны даход на кожнага члена сям'і за 2006 год не перавышае 101 760 рублёў і ў памеры 50 працэнтаў — калі даход на кожнага члена сям'і не перавышае 135 680 рублёў.

Дарэчы, паводле даных міністэрства, напрыканцы мінулага года дапамогі на дзяцей ва ўзросце звыш 3 гадоў у цэлым па Беларусі прызначаліся больш чым на 250 тыс. чалавек.

Сяргей ГРЫБ.

НАВАГОДНЯЕ ВІНШАВАННЕ

Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі беларускаму народу 31 снежня 2006 г.

Дарагія суайчыннікі!
Сябры!
Паважаныя госці Беларусі!

Дзве тысячы шосты год адыходзіць у гісторыю. Праз некалькі мінут мы з вамі, наша дзяржава станем больш дарослымі.

Мы расстаёмся з адыходзячым годам з сумам і радасцю.

З сумам, таму што кожны яго дзень — гэта пражыты дзень нашага жыцця.

З радасцю, таму што наперадзе — новыя надзеі і чаканні.

Нашы прадзеды вучылі: лёгкага хлеба не бывае. Мінулы год, на жаль, не стаў выключэннем для Беларусі.

Гаворачы шчыра, ён быў вельмі напружаным і складаным.

Мы хацелі менш займацца палітыкай, а больш — эканомікай і дабрабытам нашых людзей. Аднак па не залежных ад нас прычынах гэта не заўсёды ўдавалася.

Нам давялося вытрымаць масіраваны знешні і ўнутраны націск у час прэзідэнцкіх выбараў.

Але спроба «расхістаць» краіну з трэскам правалілася. Мудры беларускі народ сказаў сваё выразнае, важкае і цвёрдае слова.

Нам чарговы раз пагражаюць эканамічнымі санкцыямі і ізаляцыяй.

Прычына гэтага простая — наша імкненне да самастойнасці і незалежнасці.

Але калі пагрозы Захаду нас ужо не здзіўляюць, то антыбеларускі настрой некаторых уладных структур нашых сяброў выклікае шкадаванне. Парушаючы раней дасягнутыя дамоўленасці, яны наносяць удар па нашаму векавому сяброўству.

Відаць, забыта старая руская мудрасць: «Бог не ў сіле, а ў праўдзе».

Справядлівы светапарадак, суверэнітэт Беларусі і дабрабыт народа — гэта аснова нашай палітыкі, ад якой мы ніколі не адступім. Як бы нам не пагражалі, як бы на нас не ціснулі!

Дарагія суайчыннікі!

І ўсё ж такі дзве тысячы шосты год быў паспяховым для краіны. Таму ў гэты святочны вечар я хачу выказаць вам усім чыстасардэчную ўдзячнасць за шчырую і добрасумленную працу, за адданасць сваёй Радзіме.

У мінулым годзе мы змаглі рэалізаваць усе намечаныя планы як у эканоміцы, так і ў сацыяльна-культурнай сферы. Мы не проста выканалі напружаныя заданні першага года новай пяцігодкі, але і стварылі добры задзел на будучае.

Наш штогадовы прырост валавога нацыянальнага прадукту больш як у два разы перавышае сярэднесусветны.

Мы пашырылі геаграфію знешнеэканамічных сувязяў, набылі новых сяброў і партнёраў на розных кантынентах планеты.

Мы ўпэўнена заявілі пра сябе ў Руху недалучэння, які аб'ядноўвае больш за сто краін.

Беларусь стала ў авангардзе міжнароднай барацьбы з гандлем людзьмі, наркатрафікам і іншымі транснацыянальнымі злачынствамі.

Фота БЕЛТА.

Таму, развіваючыся з адыходзячым годам, мы павінны быць яму ўдзячныя.

Ён многаму навучыў нас і ўсяліў упэўненасць у моц нацыі.

Але кожны з нас павінен дакладна засвоіць некалькі важных урокаў.

Помніце: ніхто не паклапоціцца пра дабрабыт нашай дзяржавы і народа, акрамя нас самих. Усё залежыць ад нашай працавітасці, творчай актыўнасці, згуртаванасці. Ад здольнасці любіць і берагчы Айчыну.

Неабходна навучыцца цаніць мір, стабільнасць і ўпэўненасць у заўтрашнім дні, аб якіх грамадзяне многіх дзяржаў могуць толькі марыць.

І, нарэшце, свае нацыянальныя інтарэсы трэба адстойваць так, як гэта рабілі нашы продкі ў самыя цяжкія моманты гісторыі Беларусі.

Дарагія сябры!

Магчыма, гэтыя словы здадуцца некаму не святочнымі і не да месца.

Але я прывык гаварыць з вамі ў любой сітуацыі шчыра і сумленна.

Нас чакае складаны і цярністы шлях. Ён не будзе ўсыпаны ружамі.

Трэба быць гатовымі да таго, што давядзецца прымаць няпростыя і неардынарныя рашэнні.

Таму што жадаючыя атрымаць за бясцэнак смачныя кавалкі ўласнасці ў Беларусі не пакінуць спроб зламаць нас эканамічна і палітычна.

Дарагія мае суайчыннікі!

Мы паставілі перад сабой цудоўную і высакародную мэту — зрабіць нашу Беларусь моцнай і квітнеючай.

І мы чаго б гэта ні каштавала гэтага дабъёмся!

А каб дасягнуць намечанага, мы павінны разлічваць толькі на сябе, на ўласныя рукі, розум і ўпартасць. Нам, беларусам, гэтага не займаць. Дабрабыт ніколі не сыпаўся на нас з неба.

Але час дыктуе іншыя ўмовы: нам трэба вучыцца працаваць у новых эканамічных рэаліях, жыць і гаспадарыць больш руплівa і беражліва.

Наша заўтра — гэта «эканоміка ведаў», новыя тэхналогіі, высокая эфектыўнасць вытворчасці.

Толькі такім чынам мы зможам умацаваць свой суверэнітэт і захаваць нашу ўтульную, чыстую і прыгожую краіну для будучых пакаленняў, для нашых дзяцей.

Мудрыя казалі: «Абваліцца той дом і загіне тая дзяржава, якая раскалолася ў сабе».

Мы ніколі не павінны дапусціць расколу, разброду і разгубленасці ў грамадстве.

Наша сіла — у адзінстве і згодзе, у імкненні кожнага мець дачыненне да агульнай справы.

Вы ж можаце быць упэўнены: улада будзе рабіць усё, каб выццё грамадзян Беларусі было дастойным.

Я глыбока веру ў шчаслівую будучыню нашага народа. І вось чаму.

У 2006 годзе ўпершыню за паўтара дзесятка гадоў устанавілася добрая дынаміка росту нараджальнасці. Значыць, нашы жанчыны адчулі ўпэўненасць у заўтрашнім дні.

І гэта, бадай, галоўны вынік адыходзячага года і добры знак будучага адраджэння нацыі.

Дарагія сябры!

Пад бой гадзіннікаў прынята загадваць жаданні.

У гэтыя мінуты ад усяго сэрца жадаю вам шчасця, здароўя, выццёвай энергіі і поспехаў!

Няхай гэты год азнамянуецца новымі здзяйсненнямі і перамогамі!

Няхай беларускія дамы будуць напоўнены дзіцячым смехам, дабрабытам і ўзаемаразуменнем!

Кожны дзень наступнага года не пакідайце без свайго клопату родных і блізкіх.

Дарыце адзін аднаму радасць, дабро і любоў!

Няхай умацоўваецца і квітнее наша родная Беларусь!

І няхай задуманае абавязкова збудзецца!

З Новым годам вас, дарагія сябры!

У Беларусі 2007 год аб'яўлены Годам дзіцяці

Фота БЕЛТА.

У Беларусі 2007 год аб'яўлены Годам дзіцяці. Аб гэтым заявіў, адказваючы на пытанні журналістаў у Жлобіне, Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, кіраўніцтва Беларусі ўжо ў 2006 годзе зрабіла сур'ёзныя заканадаўчыя захады па абароне дзяцей, павышэнню патрабаванняў да нядбайных бацькоў. «У наступным годзе мы максімум зробім для дзіцяці», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Падводзячы вынікі 2006 года — Года маці, Прэзідэнт падкрэсліў, што ўпершыню за апошнія гады ў Беларусі адзначана вельмі добрая дынаміка прыросту насельніцтва. «Гэта галоўны вынік работы сістэмы аховы здароўя і адукацыі», — сказаў Прэзідэнт. Пры гэтым ён выказаў удзячнасць беларускім жанчынам. «Дзеці — гэта наша будучыня», — сказаў на заканчэнне кіраўнік дзяржавы.

Марыя АГАФОНАВА, БЕЛТА.

У Гродзенскім радзільным доме ўстаноўлены новы рэкорд. Калі летась першае дзіця тут з'явілася на свет у нуль гадзін пятнаццаць хвілін першага дня новага года, то сёлета — на дзесяць хвілін раней. Зноў гродзенцам удалося апярэдзіць усю краіну.

Першынец, хлопчык вагой ажно чатыры кілаграмы сто пяцьдзесят грамаў, стаў другім дзіцем у Надзеі РАГАШКА **(на фота)**. А ўвогуле 1 студзеня 2007-га, паводле інфармацыі галоўнага ўрача раддома Віктара Лісковіча, нарадзіліся шэсць дзяўчынак і тры хлопчыкі (пяць мам — з абласнога цэнтра, тры — з Бераставіцкага раёна і адна — з Парэчча Гродзенскага раёна), прычым чацвёра новых жыхароў Гродзеншчыны важылі больш за чатыры кілаграмы. Усе дзеці і іх мамы адчуваюць сябе добра.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 770

АБ ПРЫСУДЖЭННІ ПРЭМІІ «ЗА ДУХОЎНАЕ АДРАДЖЭННЕ» 2006 ГОДА

Разгледзеўшы прадстаўленні Міністэрства культуры, савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва, узгодненыя з кіраўніцтвам Беларускай праваслаўнай царквы, **пастанаўляю**:

1. За актыўную падзвіжніцкую дзейнасць у гуманітарнай галіне, накіраваную на развіццё прагрэсіўных мастацка-маральных традыцый, што садзейнічаюць усталяванню духоўных каштоўнасцяў, ідэй дружбы і братэрства паміж людзьмі розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў, прысудзіць прэмію «За духоўнае адраджэнне» 2006 года (далей — прэмія):

Бліну Уладзіславу Уладзіслававічу — намесніку старшыні рэспубліканскага рэлігійнага аб'яднання «Канферэнцыя каталіцкіх біскупаў на Беларусі», ардынарнаму епіскапу мясцовага рэлігійнага аб'яднання «Віцебская дыяцэзія Рымска-каталіцкага касцёла ў Рэспубліцы Беларусь»;

Ганагу Барысу Аляксандравічу — выкладчыку школы катэхізатараў пры мясцовым рэлігійным аб'яднанні «Мінская епархія Беларускай праваслаўнай царквы»;

Каранеўскаму Паўлу Сямёнавічу — намесніку генеральнага дырэктара закрытага акцыянернага таварыства «Сталічнае тэлебачанне»;

Шалуху Ігару Міхайлавічу — благачыннаму прыходаў Мядзельскай акругі мясцовага рэлігійнага аб'яднання «Мінская епархія Беларускай праваслаўнай царквы», настаяцелю рэлігійнай абшчыны «Прыход храма Святой Жываначальнай Троіцы ў г. Мядзелі Мінскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы»;

аўтарскаму калектыву цыкла публікацый «В поисках утраченного» ў складзе **Карлюкевіча Аляксандра Мікалаевіча** — дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і мастацтва», **Ліхадзедава Уладзіміра Аляксеевіча** — намесніка начальніка аддзела продажаў адкрытага акцыянернага таварыства «Ай Сі Імпекс», **Якубовіча Паўла Ізотавіча** — галоўнага рэдактара ўстановы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия».

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату прэмій са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад абкладання падаходным падаткам з фізічных асоб.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.

31 снежня 2006 г., г. Мінск.

Прэзідэнт Беларусі наведаў падземны грамадска-гандлёвы цэнтр «Сталіца»


Фота БЕЛТА.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 31 снежня наведаў падземны грамадска-гандлёвы цэнтр «Сталіца», размешчаны на плошчы Незалежнасці ў Мінску.

Візіты кіраўніка дзяржавы напярэдадні Новага года на розныя сацыяльна значныя аб'екты сталі ўжо добрай традыцыяй. «Сталіца» — унікальны для Беларусі шматфункцыянальны гандлёвы цэнтр, які ўжо заслужыў высокую ацэнку замежных гасцей.

Як расказаў Прэзідэнту галоўны архітэктар Мінска Віктар Нікіцін, пры будаўніцтве грамадска-гандлёвага цэнтра «Сталіца» ўлічваўся лепшы вопыт еўрапейскіх краін. Цэнтр «Сталіца» размешчаны на чатырох падземных паверхах агульнай плошчай 103 тыс. кв.м. Тут знаходзіцца паркінг, дзе прадугледжана месца для амаль 500 легкавых аўтамабіляў. У комплексе — больш за 100 розных магазінаў, кіёскі, кафэ, рэстараны, бары, аддзяленні банкаў, залы гульнявых аўтаматаў, більярдны клуб, даведачна-інфармацыйныя службы.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

Актуальна

Разлік цаны расійскага газу для Беларусі з 2008 года будзе ажыццяўляцца па еўрапейскай формуле

Нагадаем, 31 снежня ў Маскве быў падпісаны кантракт на пастаўку і транзіт газу на 2007—2011 гады. Так, цана расійскага газу пры пастаўках у 2007 годзе складзе $100 за 1 тыс. куб.м, а стаўка транзіту газу па тэрыторыі Беларусі ўзрасце з $0,75 да $1,45 за прапампоўванне 1 тыс. куб.м на 100 км.

З 1 студзеня 2008 года формула цаны на газ будзе адпавядаць аналагічным разлікам пры пастаўках расійскага газу ў Еўропу. Пры гэтым прадугледжаны паніжаючыя каэфіцыенты. На 2008 год — гэта 67 працэнтаў, на 2009 год — 80 працэнтаў, на 2010 год — 90 працэнтаў. Да 2011 года Беларусь выйдзе на 100-працэнтную аплату цаны па еўрапейскай формуле.

Як адзначыў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі, гэты кантракт заключаны на нявыгадных для Беларусі ўмовах. Фактычна цана газу ўзрасла больш як у 2 разы.

«Безумоўна, для беларускай эканомікі, якая не мае сыравінных рэсурсаў, якая гэтак жа, як і расійская эканоміка, развіваецца ў складаных умовах, трэба будзе шукаць рэзервы, каб развіваць эканоміку ў адпаведнасці з зададзенымі тэмпамі», — падкрэсліў Сяргей Сідорскі.

Ён адзначыў, што $100 — складаная цана для эканомікі Беларусі, «непад'ёмная, таму і ўраду, і тым, хто заняты ў рэальнай эканоміцы, трэба будзе шмат працаваць».

Паводле слоў прэм'ера, калі не будзе хапаць сродкаў на аплату паставак газу, Беларусь мае намер весці перагаворы з «Газпрамам» аб прадастаўленні адтэрміновак, растэрміновак плацяжоў.

Сяргей Сідорскі праінфармаваў, што бакі вялі размову аб цане $75. З 1 студзеня 2007 года кошт газу ў Расіі ў дзевятым поясе складзе $54. «Мы прапаноўвалі стартаваць для Беларусі з $75. Гэта значыць, мы былі гатовы прыбавіць $21 на карысць «Газпрама». Але нам сказалі «не». Аднак, паважаючы нашых партнёраў, у тым ліку еўрапейскіх, якія звярталіся да нас на працягу апошніх двух дзён, мы вымушаны былі згадзіцца з гэтай цаной. Будзе цяжка, але Беларусі давядзецца, як заўсёды, выстаяць у складаных умовах», — растлумачыў ён.

«Нам паставілі ўмову — у 2 разы ўзняць цану на газ. Мы згадзіліся. Згадзіліся толькі таму, што мы яшчэ раз дэманструем наша партнёрства з Расійскай Федэрацыяй і тое, што мы надзейныя партнёры», — адзначыў кіраўнік беларускага ўрада.

«Я размаўляў з прэм'ерамі суседніх дзяржаў, краін Еўрапейскага саюза, і мы абяцалі, што прымем стрыманыя рашэнні, якія дадуць нашым партнёрам у Еўропе ўпэўненасць у тым, што Беларусь — надзейны партнёр. Савет Бяспекі нашай краіны, урад прынялі рашэнне калегіяльна. Мы ідзём на гэтыя $100, вельмі складаныя, і будзем вырашаць гэтыя пытанні ў краіне самастойна», — сказаў Сяргей Сідорскі. «Беларусь заўсёды выстойвала ў самых складаных умовах, — адзначыў ён. — Мы зробім усё, каб нашы людзі, наш народ не адчуваў гэтага павышэння».

Акрамя таго, 31 снежня ў Маскве быў падпісаны пратакол аб стварэнні сумеснага беларуска-расійскага газатранспартнага прадпрыемства на базе ААТ «Белтрансгаз». Сяргей Сідорскі адзначыў, што, узяўшы на сябе абавязацельства аб стварэнні такога СП яшчэ чатыры гады таму, Беларусь паслядоўна выконвала іх перад Расійскай Федэрацыяй. «Перашкодай была цана», — дадаў ён.

Незалежная кампанія аціаніла сістэму «Белтрансгаз» ў больш як $5 млрд. «Тут з нашымі калегамі мы знайшлі разуменне. $5 млрд — гэта фіксаваная на сёння цана «Белтрансгазу». Мы дамовіліся аб тым, што 50-працэнтны пакет акцый гэтага прадпрыемства пяройдзе «Газпраму», які на працягу чатырох гадоў роўнымі долямі будзе выплачваць Беларусі палавіну кошту «Белтрансгазу». У гэтых умовах мы стартуем з пачатку 2007 года», — растлумачыў прэм'ер-міністр.

Паводле яго слоў, пакуль не вырашаным для бакоў застаецца пытанне, якое датычыцца пошлін на нафту. «Беларусь плаціць за нафту па сусветных цэнах. Нам прапаноўваюць яшчэ да гэтых цэн дабавіць $160 з 1 студзеня 2007 года. Таму я далажыў Савету Бяспекі нашай краіны аб тым, што эканоміка краіны не ў стане купляць нафту даражэй, чым па сусветных цэнах», — сказаў Сяргей Сідорскі.

Нагадаем, пры ўвядзенні ўвазных мытных пошлін на нафту для Беларусі цана паставак павялічыцца да больш як $400. Таму Беларусь адмовілася ад куплі нафты ў Расіі на такіх умовах.

«Ужо некалькі дзён мы не вядзём закупку. Нашы партнёры — расійскія нафтавыя кампаніі — таксама са шкадаваннем, разуменнем ставяцца да гэтага пытання, таму што няма сэнсу пастаўляць па такіх завышаных цэнах у Беларусь нафту», — растлумачыў кіраўнік урада.

Сяргей Сідорскі таксама паведаміў, што Беларусь прапанавала Расіі падзяліць экспартныя пошліны на нафтапрадукты ў суадносінах 50 на 50.

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ПАВІНШАВАЎ ФІДЭЛЯ КАСТРА РУСА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 1 студзеня павіншаваў старшыню Дзяржаўнага Савета і Савета Міністраў Рэспублікі Куба Фідэля Кастра Руса з нацыянальным святам — Днём Вызвалення.

Нашы краіны прадэманстравалі, што можна праводзіць незалежную палітыку, накіраваную на справядлівае вырашэнне міжнародных праблем.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Народ Беларусі не павінен адчуць няхватку паліва на ўнутраным рынку

Беларусь пагадзілася падпісаць нявыгаднае пагадненне з Расіяй па пастаўках прыроднага газу ў абмен на абяцанне вырашыць праблему з нафтай. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па пытаннях забеспячэння краіны энергарэсурсамі.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў канцы мінулага года Расійская Федэрацыя зрабіла ў адносінах да Беларусі «вельмі недружалюбныя крокі, калі не сказаць больш, у сферы гандлёва-эканамічных адносінаў, узняўшы практычна ў 2,5 раза цэны на газ і ўзняўшы цану на нафту да такога ўзроўню, што яна фактычна нам аказалася непатрэбнай». Як растлумачыў Аляксандр Лукашэнка, у гэтым выпадку Беларусь на кожнай тоне перапрацоўкі нафты страчвае да $50—60. «Такая цана нас не задавальняе, і такі бізнэс у свеце нідзе не існуе», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ён даў прамое ўказанне прэм'ер-міністру «падпісаць нявыгаднае пагадненне з Расійскай Федэрацыяй па пастаўках і цэнах прыроднага газу на будучы год — яны сапраўды нявыгадныя для нашай краіны». Прэзідэнт Беларусі растлумачыў: «Я зрабіў гэты крок, таму што ўрад і кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі паабяцалі нам вырашыць праблему з нафтай. Было заяўлена: як толькі будзе вырашана пытанне па кантрактах на прыродны газ і транзіт газу ў Еўропу праз Беларусь, будзе вырашана пытанне па пастаўках сырой нафты».

Паводле яго слоў, прапановы беларускага боку Расіі былі выкладзены даўно. Беларусь згодна на ўвядзенне пошлін на светлыя нафтапрадукты, і мы гатовы дзяліць гэтыя пошліны напалавіну — 50х50. «Як я разумею, на сённяшні дзень гэта пытанне не вырашана», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў забяспечыць унутраную патрэбнасць краіны ў нафтапрадуктах.

«Народ павінен быць абсалютна ўпэўнены, што ў Беларусі і бензіну, і саляркі, і маслаў, і ракетнага паліва будзе дастаткова», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. «Калі мне даложаць, што на якой-небудзь запраўцы няма паліва — крыўдуйце самі на сябе», — падкрэсліў Прэзідэнт, звяртаючыся да ўдзельнікаў нарады.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў загрузіць беларускія НПЗ на 100 працэнтаў

Пры гэтым ён падкрэсліў: «НПЗ павінны працаваць з нармальнай эканомікай і рэнтабельнасцю не ніжэй як у 2006 годзе». «Бюджэт не павінен панесці страту ні на капейку», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Кіраўнік дзяржавы не выключыў, што Беларусь можа паставіць перад Расійскай Федэрацыяй пытанне аб аплаце транзіту нафты праз рэспубліку, зямлі, якая выкарыстоўваецца пад нафта- і газатрубы, а таксама пытанне аб уласнасці Расійскай Федэрацыі ў Беларусі.

«Мы перад Расіяй чыстыя на 100 працэнтаў, мы зрабілі ўсё, што яны хацелі. Настаў час запатрабаваць ад Расіі выканаць свае абяцанні. Калі гэтага няма — то мы маем права таксама мець свабоду дзеянняў», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы на нарадзе па пытаннях забеспячэння краіны энерганосьбітамі.

У першым квартале гэтага года Расіі павінны быць накіраваны прапановы па аплаце ўсіх паслуг, якія яна атрымлівала ў Беларусі бясплатна, пачынаючы ад ваенных аб'ектаў і завяршаючы транзітам, заявіў Прэзідэнт.

«Я далёкі ад таго, каб нагнятаць абстаноўку. Але калі ў Расіі, захліпаючыся ад нафтадолараў і іншых паступленняў валюты, вырашылі адыграцца на Беларусі і паставілі нас ва ўмовы работы горшыя, чым Германію і іншыя еўрапейскія краіны, давайце папросім Расійскую Федэрацыю — такую багатую і вялізную — заплаціць нам за нашы паслугі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

Для насельніцтва Беларусі рост цэн на газ не будзе шокам

Рост цэн на расійскі газ у Беларусі не прывядзе да рэзкага павелічэння цэн на жыллёва-камунальныя паслугі для насельніцтва. Аб гэтым заявіў 2 студзеня першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка на сустрэчы з журналістамі.

Ён адзначыў, што «для насельніцтва шоку ад росту цэн не будзе, пры ўсёй складанасці сітуацыі ў эканоміцы». Па-ранейшаму рост цэн у камунальнай сферы захаваецца на ўзроўні не больш за $5—6 за год. Такое павышэнне будзе, іншага — не будзе, падкрэсліў Уладзімір Сямашка. Усю нагрузку возьмуць на сябе прадпрыемствы.

Першы віцэ-прэм'ер таксама адзначыў, што павысяцца тарыфы на энерганосьбіты для рэальнага сектара эканомікі.

«Каб рост цэн на энерганосьбіты не быў шокам у перспектыве, трэба займацца энергазберажэннем», — падкрэсліў Уладзімір Сямашка. Ён нагадаў, што эфектыўнасць эканомікі краіны вызначаецца па пэўнаму паказчыку: колькі траціцца паліва на вытворчасць прадукцыі. У Беларусі на вытворчасць адной тысячы долараў валавога ўнутранага прадукту затрачваецца 460 кг нафтавага эквіваленту. Гэта лепшы паказчык энергазатрат у СНД. Разам з тым у Еўропе гэты паказчык значна ніжэйшы і складае 140—160 кг паліва на адну тысячу долараў ВУП. Для нашай краіны ёсць вялікія рэзервы, каб знізіць спажыванне энерганосьбітаў на вытворчасць прадукту, адзначыў Уладзімір Сямашка.

Лілія КРАПІВІНА, БЕЛТА.

(Працяг тэмы на 3-й стар.)

ФМС Расіі 29 снежня неабгрунтавана спыніла афармленне цукру з Беларусі

Федэральная мытная служба Расіі неабгрунтавана з 29 снежня 2006 года спыніла мытнае афармленне беларускага цукру на Траякураўскім мытным посце, паведаміў сёння журналістам старшыня канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Іван Данчанка.

Гэта адбылося насуперак дасягнутай дамоўленасці прэзідэнтаў Расіі і Беларусі ў бліжэйшы час вырашыць канфліктную сітуацыю па пастаўках беларускага цукру ў РФ. Такім чынам, экспарт цукру з Беларусі на расійскі рынак практычна прыпынены.

«Існуючая сітуацыя стала вынікам шэрагу абмежавальных мераў з боку ФМС Расіі, якія прывялі да фактычнай забароны паставак беларускага цукру на расійскі рынак», — сказаў Іван Данчанка.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

Шайбу, шайбу!

Калядны турнір

Учора ў Мінску адбылася афіцыйная цырымонія адкрыцця Каляднага міжнароднага турніру аматараў хакею на прызы Прэзідэнта Беларусі. У ёй узяў удзел кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў міністра спорту і турызму Аляксандра Грыгарава, галоўнай асаблівасцю сёлетніх спаборніцтваў, трэціх па ліку, стала самае вялікае прадстаўніцтва ўдзельнікаў — 12 каманд (Расія, Украіна, Казахстан, Славакія, Канада, Германія, Фінляндыя і г. д.). На лёдзе сустрэнуцца ветэраны і моладзь: хакеісты, якія на працягу пяці апошніх гадоў не выступалі на афіцыйных міжнародных стартах, а таксама па пяць ігракоў у адной дружыне ва ўзросце не больш чым 25 гадоў.

Каманды падзелены на чатыры групы. У прыватнасці беларуская дружына стартуе ў трыо «А», дзе сустрэнецца з украінцамі і швейцарцамі. Матчы праходзяць на трох сталічных арэнах: у Палацы спорту, у парку Горкага і ў Лядовым палацы па вуліцы Прытыцкага. Старшыня федэрацыі хакея краіны Уладзімір Навумаў запэўніў, што ўдзельнікі па-за лёдам сумаваць не будуць, бо запланавана цікавая культурная праграма.

Што чакаюць ад удзелу навічкі і якое ўражанне ў іх ад арганізацыі спаборніцтваў? Напрыклад, Сціў Байсвангер, ігрок канадскай каманды, якая ўпершыню завітала ў Мінск, адзначыў: «Турнір арганізаваны на добрым узроўні. Я вельмі ўдзячны беларускай федэрацыі хакея, што нас запрасілі прыехаць, бо гэта для нас — цудоўная магчымасць атрымаць новы вопыт і пазнаёміцца з новай краінай. Аднак канадцы прызвычаіліся выкладвацца па максімуму, таму будзем змагацца за прызавыя месцы». Што ж датычыцца «старэнькіх», якія ўжо двойчы былі ў фінале (маю на ўвазе расійскую дружыну), то Аляксандр Мядзведзеў, капітан каманды, намеснік кіраўніка Газпрама, заўважыў, што каляднымі турнір у Мінску — гэта заўжды адсутнасць дагаворных матчаў, прыгажосць і бяспека. Пераможца спаборніцтваў стане вядомы напярэдадні Калядаў. Чакаецца, што ў саставе беларускай каманды, якая перамагала на турніры, згуляе і Прэзідэнт нашай краіны.

Ірына ПРЫМАК.

ISSN 1990-763X

ЗВЯЗДА 4 студзеня 2007 г.

Закон Рэспублікі Беларусь

АБ БЮДЖЭЦЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ НА 2007 ГОД

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 11 снежня 2006 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 20 снежня 2006 года

Артыкул 1. Зацвердзіць рэспубліканскі бюджэт на 2007 год па расходах у суме 32 011 083 279,0 тыс. рублёў выходзячы з прагназуемага аб'ёму даходаў у суме 30 611 83 279,0 тыс. рублёў.

Устанавіць межавы памер дэфіцыту рэспубліканскага бюджэту на 2007 год у суме 1 400 000 000,0 тыс. рублёў.

Ажыццявіць фінансаванне дэфіцыту рэспубліканскага бюджэту ў 2007 годзе згодна з дадаткам 1.

Артыкул 2. Рэспубліканскі фонд падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, харчавання і аграрнай навукі, рэспубліканскі дарожны фонд, рэспубліканскі фонд аховы прыроды, фонд нацыянальнага развіцця, фонд арганізацыі збору (нарыхтоўкі) і выкарыстання адходаў у якасці другаснай сыравіны, інавацыйныя фонды і фонд развіцця будаўнічай навукі, якія ўтвараюцца ў адпаведнасці з гэтым Законам*, у 2007 годзе з'яўляюцца дзяржаўнымі мэтавымі бюджэтнымі фондамі.

Артыкул 3. Уключыць у 2007 годзе:

у рэспубліканскі бюджэт сродкі дзяржаўных мэтавых бюджэтных фондаў: рэспубліканскага фонду падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, харчавання і аграрнай навукі, рэспубліканскага дарожнага фонду, рэспубліканскага фонду аховы прыроды, фонду нацыянальнага развіцця, фонду арганізацыі збору (нарыхтоўкі) і выкарыстання адходаў у якасці другаснай сыравіны, інавацыйных фондаў і фонду развіцця будаўнічай навукі, а таксама сродкі дзяржаўнага пазабюджэтнага Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь;

у мясцовыя бюджэты сродкі інавацыйных фондаў, якія ўтвараюцца абласнымі і Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтамі, а таксама сродкі пазабюджэтных фондаў, якія ствараюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь мясцовымі Саветамі дэпутатаў або выканаўчымі і распарадчымі органамі.

Артыкул 4. Устанавіць, што ў 2007 годзе:

1. Даходы рэспубліканскага бюджэту складаюць 30 611 083 279,0 тыс. рублёў згодна з дадаткам 2.

2. Даходы рэспубліканскага бюджэту фарміруюцца за кошт:

2.1. падаткаў, збораў (пошлін):

падаткаў на даходы і прыбытак (за выключэннем адлічэнняў, якія перадаюцца ў бюджэты абласцей і г. Мінска ў памерах, прадугледжаных абзацам другім артыкула 6 гэтага Закона, і падатку на даходы, які залічваецца ў бюджэты абласцей і г. Мінска ў адпаведнасці з абзацам трэцім падпункта 1.1 пункта 1 артыкула 7 гэтага Закона);

падатку на дабаўленую вартасць (за выключэннем адлічэнняў, якія перадаюцца ў бюджэты абласцей і г. Мінска ў памерах, прадугледжаных абзацам трэцім артыкула 6 гэтага Закона);

акцызаў (за выключэннем акцызаў, якія поўнасцю залічваюцца ў бюджэты абласцей і г. Мінска ў адпаведнасці з абзацам восьмым падпункта 1.1 пункта 1 артыкула 7 гэтага Закона);

мытных пошлін і мытных збораў;

падатку на выкарыстанне прыродных рэсурсаў (экалагічнага падатку) (за выключэннем экалагічнага падатку, які залічваецца ў бюджэты абласцей і г. Мінска ў адпаведнасці з абзацам шостым падпункта 1.1 пункта 1 артыкула 7 гэтага Закона);

падаткаў, збораў і іншых плацяжоў, якія залічваюцца ў рэспубліканскі бюджэт у адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 20 і пунктам 2 артыкула 21 гэтага Закона;

іншых падаткаў, збораў (пошлін) у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь;

2.2. непадатковых даходаў:

за карыстанне банкамі грашовымі сродкамі рэспубліканскага бюджэту;

па бюджэтных пазыках, прадастаўленых за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту;

дывідэндаў на долі (акцыі), якія знаходзяцца ў рэспубліканскай уласнасці;

часткі прыбытку, які плоціцца арганізацыямі ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь;

арэнднай платы ад здачы маёмасці, якая знаходзіцца ў рэспубліканскай уласнасці, у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь;

ад рэалізацыі рэспубліканскай маёмасці (у тым ліку ад продажу юрыдычным асобам Рэспублікі Беларусь і замежным дзяржавам зямельных участкаў, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь), а таксама маёмасных правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці;

ад рэалізацыі канфіскаванай і іншым спосабам звернутай у даход дзяржавы маёмасці (за выключэннем даходаў, якія залічваюцца ў бюджэты абласцей і г. Мінска ў адпаведнасці з абзацам чацвёртым падпункта 1.2 пункта 1 артыкула 7 гэтага Закона);

штрафаў у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь;

іншых даходаў у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

3. Даходы бюджэтаў свабодных эканамічных зон, якія ўключаюцца ў рэспубліканскі бюджэт, фарміруюцца за кошт падаткаў на даходы і прыбытак, акцызаў, якія плоціцца рэзідэнтамі свабодных эканамічных зон (за выключэннем тых, якія спаганяюцца пры ўвозе на мытную тэрыторыю Рэспублікі Беларусь).

4. Падаткі, зборы (пошліны) і іншыя даходы, указаныя ў пунктах 2 і 3 гэтага артыкула, залічваюцца на адзіны казначэйскі рахунак Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь і размяркоўваюцца ў адпаведнасці з гэтым Законам.

Артыкул 5. Устанавіць, што ў 2007 годзе:

1. Плацяжы надзвычайнага падатку для ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС (далей — надзвычайны падатак) і абавязковыя адлічэнні ў дзяржаўны фонд садзейнічання занятасці, якія праводзяцца адзіным плацяжом арганізацыямі, а таксама плацяцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі ў адпаведнай тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, залічваюцца ў бюджэты абласцей і г. Мінска;

падатку на дабаўленую вартасць — 30 працэнтаў, у тым ліку ў бюджэты: Брэсцкай вобласці — 4,44 працэнта, Віцебскай — 3,99, Гомельскай — 4,56, Гродзенскай — 3,45, Мінскай — 4,53, Магілёўскай вобласці — 3,54, г. Мінска — 5,49 працэнта.

Артыкул 7. Устанавіць, што ў 2007 годзе:

1. У поўным аб'ёме залічваюцца ў бюджэты абласцей і г. Мінска:

1.1. падаткі, зборы (пошліны):

падаходны падатак з фізічных асоб;

падатак на даходы ад ажыццяўлення латарэйнай дзейнасці па мясцовых латарэях;

падатак на нерухомасць;

зямельны падатак;

падатак за выкарыстанне прыродных рэсурсаў (экалагічны падатак) у частцы плацяжоў за выкарыстанне (канфіскацыю, здабычу) прыродных рэсурсаў і плацяжоў за перапрацоўку нафты і нафтапрадуктаў арганізацыямі, якія ажыццяўляюць перапрацоўку нафты;

падатак пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання;

акцызы па віну, напіткам слабаалкагольных і вінных (акрамя акцызаў на ўказаныя тавары, якія спаганяюцца пры ўвозе на мытную тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, а таксама плацяцца ў бюджэты свабодных эканамічных зон у адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 4 гэтага Закона);

адзіны падатак з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб;

адзіны падатак для вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі;

падатак на ігральны бізнэс;

іншыя падаткі, зборы (пошліны) у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь;

1.2. непадатковыя даходы:

за карыстанне банкамі грашовымі сродкамі мясцовых бюджэтаў;

па бюджэтных пазыках, прадастаўленых за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў;

сродкі, атрыманыя ад рэалізацыі безгаспадарнай маёмасці і кладаў;

арэндная плата ад здачы маёмасці, якая знаходзіцца ў камунальнай уласнасці, у тым ліку за зямельныя ўчасткі, у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь;

ад рэалізацыі камунальнай маёмасці, у тым ліку ад продажу грамадзянам Рэспублікі Беларусь зямельных участкаў, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці;

штрафы ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь;

іншыя паступленні ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

2. Падаткі (за выключэннем падатку на дабаўленую вартасць), зборы (пошліны), выплачаныя зноў створанымі ў 2007 годзе ў гарадах раённага падпарадкавання з колькасцю насельніцтва да 50 тысяч чалавек, пасёлках гарадскога тыпу, сельскіх населеных пунктах арганізацыямі, якія ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць (акрамя гандлёва-пасрэдніцкай дзейнасці), з сярэдняй колькасцю работнікаў не больш за 100 чалавек (за выключэннем рэспубліканскіх унітарных прадпрыемстваў і гаспадарчых таварыстваў з доляй рэспубліканскай уласнасці), поўнасцю залічваюцца ў адпаведныя мясцовыя бюджэты па месцы пастаноўкі гэтых арганізацый на ўлік у падатковых органах з дня іх дзяржаўнай рэгістрацыі да 1 студзеня 2011 года.

Артыкул 8. У 2007 годзе:

1. Абласныя, Мінскі гарадскі Саветы дэпутатаў, Саветы дэпутатаў базавага тэрытарыяльнага ўзроўню ў адпаведнасці з пунктам 3 гэтага артыкула маюць права ўводзіць на тэрыторыі адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак наступныя мясцовыя падаткі і зборы:

1.1. падатак з продажу тавараў у рознічным гандлі.

Плацельшчыкамі падатку з продажу тавараў у рознічным гандлі з'яўляюцца арганізацыі, вызначаныя пунктам 2 артыкула 13 Агульнай часткі Падатковага кодэксу Рэспублікі Беларусь (далей у гэтым артыкуле і артыкуле 9 гэтага Закона — арганізацыі) і індывідуальныя прадпрымальнікі (за выключэннем індывідуальных прадпрымальнікаў — плацельшчыкаў адзінага падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб, а таксама індывідуальных прадпрымальнікаў і арганізацый, якія прымяняюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання, і арганізацый, што плацяць адзіны падатак для вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі).

Па тавараў, якія падлягаюць маркіроўцы спецыяльнымі контрольнымі маркамі ці спецыяльнымі марачнымі знакамі, падатак плоціцца пры набыцці гэтых тавараў арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія ажыццяўляюць гандлёвую дзейнасць, пры ўвозе тавараў на мытную тэрыторыю Рэспублікі Беларусь і пры рэалізацыі тавараў, якія засталіся нерэалізаванымі на момант спынення дзейнасці арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, пры пераходзе арганізацыі на спрошчаную сістэму падаткаабкладання, пры пераходзе арганізацыі на выкананне абавязкаў плацельшчыка адзінага падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб, пры пераходзе індывідуальнага прадпрымальніка на выкананне абавязкаў плацельшчыка адзінага падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб

Цана газу для спажыўцоў у 2007 годзе павялічыцца да больш як $150 за 1 тыс. куб.м

Цана газу для спажыўцоў Беларусі павялічыцца з $75,4 у 2006 годзе да $150—153 за 1 тыс. куб.м. Аб гэтым паведаміў 2 студзеня журналістам першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка, каментуючы падпісаны ў Маскве кантракт на пастаўку газу ў Беларусь.

Цана на іншыя віды электраэнергіі ў выніку таксама павысіцца. На электрычную энергію цана ўзрасце на 54 працэнты і складзе 11,1 цэнта за кВт/гадз. На цеплавую электраэнергію — на 55 працэнтаў да $24,5—25 за адну Гкал.

Паводле слоў Уладзіміра Сямашкі, гэта цяжкае выпрабаванне для рэальнага сектара эканомікі. Тым не менш, «гэта ўсё пад'ёмна, тыя тэмпы аб'ёмаў вытворчасці, якія зададзены на 2007 год, будуць выконвацца». Разам з тым ён прызнаў, «што кошт энергетыкі ў сабекошце вытворчасці прадукцыі будзе павялічвацца». Асаблівым цяжарам гэта ляжа на энергаёмістыя прадпрыемствы. У іх ліку ААТ «Гродна Азот», цэментныя заводы. Для гэтых прадпрыемстваў урад будзе ўстанаўліваць «эксклюзіўныя» цэны на энерганосьбіты, адзначыў першы віцэ-прэм'ер. Пры гэтым ён падкрэсліў, што ні адна з эканамічных і сацыяльных праграм, якія намечаны на гэты год, не спыніцца.

Лілія КРАПІВІНА, БЕЛТА.

ФМС Расіі 29 снежня неабгрунтавана спыніла афармленне цукру з Беларусі

(Заканчэнне. Пачатак на 1 стар.)

За 2006 год аб'ём рэалізацыі цукру ў Расіі скараціўся на 50 працэнтаў. Найбольш значнае зніжэнне адбылося ў чацвёртым кварталe мінулага года, калі пачалася перапрацоўка цукровых буракоў новага ўраджаю. Усяго за чацвёрты квартал беларускім вытворцам удалося паставіць на расійскі рынак толькі 37 тыс. тон цукру з сыравіны новага ўраджаю. На Траякураўскі мытны пост паступіла з Беларусі 580 вагонаў, з іх 11 вагонаў да гэтага часу не афармлены. Цукар знаходзіцца пад адкрытым небам у сырое надвор'е, што прыводзіць да каласальных страт як цукравытворцаў, так і чыгуначнікаў. Толькі з-за несвоечасовага мытнага афармлення і прастояў вагонаў беларускія прадпрыемствы панеслі страты ў памеры $2 млн.

Расійскія партнёры, якім накіроўваўся беларускі цукар, звярнуліся ў арбітражны суд, ён прызнаў дзеянні расійскіх мытнікаў неправамернымі. У сувязі з гэтым страты прадпрыемстваў Расіі павінны быць кампенсаваны з федэральнага бюджэту РФ.

На думку Івана Данчанкі, расійскія мытнікі дзейнічаюць, каб дагадзіць невялікай групе расійскіх бізнэсменаў, якія хочуць паставіць пад кантроль увоз цукру з Беларусі і такім чынам захаваць на расійскім рынку манаполію.

Таццяна ЛОБАС, БЕЛТА.

Большасць грамадзян Беларусі лічыць палітыку РФ у адносінах да краін-суседзяў няправільнай і недальнабачнай

Большасць грамадзян Беларусі лічыць палітыку Расіі ў адносінах да краін-суседзяў няправільнай і недальнабачнай. Такую выснову можна зрабіць з вынікаў сацапытання, праведзенага ў снежні 2006 года аналітычным цэнтрам EcooM.

40,3 працэнта рэспандэнтаў на пытанне аб тым, як яны ацэньваюць палітыку Расіі ў адносінах да краін-суседзяў апошнім часам, адказалі — «няправільная». Яшчэ 27,7 працэнта ўдакладнілі — «няправільная і недальнабачная». Як правільную, але з некаторымі памылкамі, расійскую палітыку характарызуюць 10 працэнтаў беларусаў. І толькі 8,9 працэнта жыхароў Беларусі, старэйшыя за 18 гадоў, лічаць дзеянні Расіі ў адносінах да краін блізкага замежжа апошнім часам абсалютна правільнымі і дальнабачнымі. 13,1 працэнта апытаных не змаглі адказаць на гэта пытанне.

Амаль палавіна беларусаў (44,5 працэнта апытаных) перакананы ў тым, што Расія робіць няправільныя высновы са сваіх няўдач у адносінах з краінамі-суседзямі. Яшчэ 22 працэнты перакананы ў тым, што расіяне проста не робяць ніякіх высноў са знешнепалітычных памылак.

У сацапытанні былі задзейнічаны 1450 грамадзян Беларусі ва ўзросце 18 гадоў і старэйшыя, якія пражываюць у розных рэгіёнах краіны.

Кар. БЕЛТА.

Прэзідэнт Беларусі наведаў падземны грамадска-гандлёвы цэнтр «Сталіца»

(Заканчэнне. Пачатак на 1 стар.)

Пры будаўніцтве прымянялiся аддзелачныя матэрыялы і абсталяванне ў асноўным беларускай вытворчасці.

Кіраўнік дзяржавы агледзеў гандлёвыя павільёны, пабываў у фірменных магазінах вядомых беларускіх вытворцаў, у тым ліку «Беліты», «Галантэі», «Элемы», шклозавода «Нёман», Мінскага завода пеністых він, кампаніі «Серж», а таксама ў аддзяленні ААБ «Беларусбанк». Прэзідэнт даў высокую ацэнку новаму сталічнаму грамадска-гандлёваму цэнтру.

Як быў праінфармаваны Прэзідэнт, апошнім часам аб'ёмы продажу прадукцыі «Нёмана», які яшчэ нядаўна знаходзіўся ў крызіснай сітуацыі, значна павялічыліся.

Аляксандр Лукашэнка пазітыўна ацаніў намеры кампаніі «Серж» па пашырэнню вытворчасці. Не выключана, што гэтаму вытворцу можа быць перададзена адно з беларускіх прадпрыемстваў. Як адзначыў Прэзідэнт, «калі будзе канкрэтная прапанова — мы яе вывучым». Пры гэтым беларускі лідар падкрэсліў, што з боку чыноўнікаў у гэтым пытанні ніякай валакіты быць не павінна.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў мінчан і гасцей сталіцы з надыходзячым Новым годам і пажадаў ім шчасця, здароўя і поспехаў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ЯКІЯ СЮРПРЫЗЫ ПАДРЫХТАВАЎ СТУДЗЕНЬ?

Паводле папярэдніх даных, у першай палове студзеня будзе пераважаць цёплае для гэтай пары надвор'е. Часамі пройдуць ападкі, у асноўным дождж. На асобных участках дарог галалёдзіца. Начная тэмпература ў сталіцы будзе вагацца ад мінус трох да плюс трох, дзённая — ад нуля да плюс трох. Аб гэтым карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга Фядотава.

У другой палове месяца, па разліках сіноптыкаў, тэмпературны фон наблізіцца да кліматычнай нормы (для Мінска — 6,9 градуса марозу), а ў асобныя суткі тэмпература чакаецца на 1—3 градусы ніжэй за норму. Уначы ў асноўным 0—мінус 5, удзень — мінус 4—+1. У найбольш халодныя ночы ў трэцяй дэкадзе студзеня слупок тэрмометра апусціцца да мінус 5—10, а ўдзень — да 6—8 градусаў марозу. У асобныя дні пройдзе кароткачасовы снег, на дарогах — галалёдзіца.

У цэлым жа студзень 2007 года чакаецца на два градусы цяплей чым звычайна і дастаткова вільготны. Па прагнозах сіноптыкаў, за месяц выпадзе 130 працэнтаў месячнай нормы ападкаў (для сталіцы яна складае 43 міліметры).

Святлана ФРАЛЯНКОВА, «Мінск—Навіны».

ПАМЫЛКІ МАЛАДОСЦІ

Са ста пар, якія ўзялі шлюб, дваццаць пяць бясплодныя з-за перанесеных раней палавых інфекцый.

Нарадзіць дзіця маладым беларусам становіцца ўсё цяжэй: адбіваюцца грахі маладосці. Сёння больш за 75 працэнтаў цяжарных жанчын маюць тыя ці іншыя захворванні, якія дрэнна ўплываюць на развіццё плода або прыводзяць да пагаршэння здароўя дзяцей. Як вынік, у рэспубліцы рэгіструецца толькі 24,5 працэнта нармальных родаў.

Алеся ШАБАН, «Мінск—Навіны».

Нядзельныя школы здзівілі сваім майстэрствам

На 5-й духоўна-асветніцкай выстаўцы-кірмашы «Ражджаство Хрыстова» адбыўся першы конкурс паміж нядзельнымі школамі праваслаўных прыходаў. Арганізатары і журы конкурсу былі прыемна здзіўлены творчым патэнцыялам дзяцей, якія прыходзяць у храм навучацца веры.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

У першым конкурсе ўдзел бралі толькі прыходы сталіцы, але вынікі аказаліся настолькі цікавымі, што наступны раз геаграфія яго будзе пашырана да межаў Мінскай епархіі. На другі дзень новага, 2007 года, дыплом пераможцаў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі ўручыў навучэнцам нядзельнай школы Свята-Мікольскага прыхода ў Шабанах. Але на самай справе вылучыць кагосьці было няпроста, бо работы ўсіх дзетак аказаліся вельмі цікавыя. Таму вырашана, што лепшыя малюнкі адправяцца на выставу ў Маскоўскі Крэмль, лепшыя харавыя калектывы выступяць на Мінскім гарадскім фестывалі сучаснай хрысціянскай музыкі «Благавест», а лепшыя тэатральныя калектывы зацікавілі галоўнага рэжысёра Тэатра юнага гледача...

Конкурс нядзельных школ стаў галоўным адкрыццём сёлетняй выстаўкі «Ражджаство Хрыстова», але не адзіным. Работа выстаўкі-кірмашу арганізавана так, што кожны наведвальнік, у які б час ён ні прыйшоў, знаходзіць тут нешта асаблівае для сябе. Гэтаму садзейнічае і насычаная асветніцкая праграма, і вельмі прыгожая экспазіцыя. Штодзень а 11-й і 15-й гадзінах дзетак чакаюць канцэртныя праграмы. А палове пятай праходзяць канцэрты дзіцячых вакальных і інструментальных калектываў — лаўрэатаў і дыпламантаў фестывалю «Благавест» і вядучых аматарскіх калектываў Мінска.

У рамках выстаўкі адбываюцца таксама мастацкія і фотаэкспазіцыі, вечарыны духоўнай паэзіі, гутаркі са святарамі. Для дзяцей і дарослых дэманструюцца кінафільмы духоўнай тэматыкі (4 снежня адбудзецца паказ фільма «Вострaў» Паўла Лунгіна), ладзяцца прэзентацыі кніг, знаёмствы з прадстаўнікамі буйнейшых манастыроў, сустрэчы з праваслаўнымі шматдзетнымі сем'ямі.

Рэдакцыя духоўна-асветніцкай газеты «Воскресение» падрыхтавала ўласныя канцэртныя праграмы і семінар «Вопыт арганізацыі праваслаўнага дзіцячага лагера».

Традыцыйна на праваслаўнай выстаўцы-кірмашы арганізаваны майстар-класы па розных відах дэкаратыўнай творчасці. Майстры тут дзеляцца сакрэтамі ткацтва, шыцця з абрэзкаў, разьбы па дрэву, ганчарнай справы, пляцення з лазы і вырабу берасцяных сувеніраў.

Як звычайна, тут можна набыць мёд і іншыя вырабы пчалярства. Шмат страў, прычым усе — посныя, прапанавана ў раздзеле «Трапеза». Свята-Елісавецінскі манастыр, які займае вялікую частку экспазіцыі, зрабіў для дзетак шалаш, у якім частуе маленькіх гасцей чаем з мёдам і іншымі прысмакамі. Увогуле экспазіцыя каляднай выстаўкі атрымалася надзвычай цікавай і прыгожай, сапраўды — святочнай.

Кірмаш, падрыхтаваны выставачным таварыствам «Экспафорум» і Мінскім епархіяльным упраўленнем Беларускай праваслаўнай царквы, праходзіць па адрасу: праспект Пераможцаў, 14. Ён будзе працаваць да 5 студзеня.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Скандал

Блокі вылезлі праз бок

Начальнік падатковай інспекцыі Смаргонскага раёна вырашыў выкарыстаць сваё службовае становішча ў асабістых мэтах і апынуўся за кратамі.

Як паведамілі «Звяздзе» ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў Пракуратуры Беларусі, напачатку кіраўнік раённай падатковай інспекцыі незаконным шляхам дапамог сыну адрамантаваць кватэру ў Мінску. Выкарыстоўваючы сваё службовае становішча, ён садзейнічаў заключэнню фіктыўнага дагавора паміж прадпрымальнікамі. За гэтую паслугу сыну начальніка зрабілі ў кватэры рамонт коштам 5 мільёнаў рублёў.

Апроч таго кіраўнік раённай падатковай інспекцыі загадаў арыштаваць прадукцыю аднаго з акцыянерных таварыстваў: партыю будаўнічых блокаў на агульную суму 704 мільёны рублёў. Па рашэнню гаспадарчага суда Гродзенскай вобласці будматэрыялы былі канфіскаваны ў даход дзяржавы. А начальнік падатковай інспекцыі Смаргонскага раёна, маючы на мэце свой карыслівы інтарэс, дабіўся ўцэнкі канфіскату на 70 мільёнаў рублёў і заключэнню дагавора аб продажы гэтых будматэрыялаў аднаму прыватнаму прадпрыемству. За гэтыя паслугі ён атрымаў хабар у памеры 18 тысяч долараў, з якіх, праўда, 2600 «зялёных» аддаў пасрэдніку. Супрацоўнікі праваахоўных органаў затрымалі прадажнага начальніка падатковай інспекцыі. А нядаўна суд Ашмянскага раёна прыгаварыў яго да 12 гадоў пазбаўлення волі.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў СТУДЗЕНІ

4, чацвер, 0.00—19.30
7, нядзеля, 0.00—5.30
9, аўторак, 12.00—17.00
12, пятніца, 1.00—6.00
14, нядзеля, 15.00—17.00
16, аўторак, 20.30—24.00
17, серада, 0.00—1.00
19, пятніца, 3.00—5.00
21, нядзеля, 4.00—8.00
23, аўторак, 6.00—10.00
25, чацвер, 9.00—12.30
27, субота, 15.00—16.00
29, панядзелак, 17.30—21.00
30, аўторак, 20.30—24.00
31, серада, 2.00—23.00

Не плаціш за кватэру – высяляйся!

Самая вялікая запазычанасць па аплаце за камунальныя паслугі ў Заводскім раёне — адзін мільярд 507 мільёнаў. Работнікі ЖРЭА з міліцыяй пабывалі ў кватэрах злосных неплацельшчыкаў. У многіх адключаны электрычнасць, вада і газ. Калі і гэта не дапамагае, ЖРЭА з іскам аб спагнанні запазычанасці звяртаецца ў суд. Як правіла, гэта мера эфектыўная і дазваляе прымусіць неплацельшчыкаў вярнуць грошы дзяржаве яшчэ да вынясення рашэння суда. Акрамя таго, з 2006 года практыкуецца і высяленне. Дзвюм сем'ям ужо давялося змяніць прапіску, а днямі суд Заводскага раёна задаволіў чарговы іск камунальнікаў. За запазычанасць па кватэрнай плаце будзе выселены са сваёй кватэры жыхар дома № 1 на вуліцы Герасіменкі. Ён адзін быў прапісаны ў чатырохпакаёвай кватэры. Не плаціў за спажытыя камунальныя паслугі больш як паўтара года. У выніку запазычанасць па кватэрнай плаце разам з пеняй склала каля 10 мільёнаў. Яго пераселяць у аднапакаёвую кватэру.

Вольга ДАЛЯНКО, «Мінск—Навіны».

oriflame

Правила проведения рекламной игры
«ОТКРОЙТЕ МОДНЫЙ СЕЗОН»

Настоящие Правила проведения рекламной игры «Откройте модный сезон» (далее — **«Правила»**) разработаны в соответствии с *Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь*, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30 января 2003 г. № 51, с последующими изменениями и дополнениями, и *Инструкцией о порядке государственной регистрации рекламных игр*, утвержденной Постановлением Министерства торговли Республики Беларусь от 26 февраля 2003 г. № 11, с последующими изменениями и дополнениями, и утверждены Приказом И.о. Директора Иностранного общества с ограниченной ответственностью «Орифлэйм Косметикс» № 124 от 30.11.2006 г.

1. Организатор Рекламной игры

Организатором проводимой в соответствии с настоящими Правилами рекламной игры является Иностранное общество с ограниченной ответственностью «Орифлэйм Косметикс», юридическое лицо по законодательству Республики Беларусь, зарегистрированное решением Минского городского исполнительного комитета № 1983 от 24 сентября 2004 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190567659 (учетный номер плательщика 190567659), расположенное по адресу: Республика Беларусь, г. Минск 220073, ул. Скрыганова, д. 6, блок 4 (далее — **«Организатор»** или **«ИООО «Орифлэйм Косметикс»**), которое проводит данную Рекламную игру в целях стимулирования реализации товаров.

2. Срок и территория проведения Рекламной игры

Рекламная игра, предусмотренная настоящими Правилами, проводится с 4 января 2007 г. по 07 марта 2007 г. на территории Республики Беларусь, г. Минск.

3. Термины и определения, применяемые в настоящих Правилах

База покупателей продукции Организатора — совокупность данных обо всех покупателях продукции ИООО «Орифлэйм Косметикс». В Базу покупателей продукции Организатора включаются следующие сведения о каждом покупателе продукции: Ф.И.О., местожительство, телефонные номера, наименование, количество и стоимость приобретенной продукции, дата приобретения продукции Организатора.

Участники Рекламной игры — совершеннолетние дееспособные граждане Республики Беларусь и лица, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, заключившие договоры купли-продажи продукции Организатора и включенные в Базу покупателей продукции Организатора и отвечающие условиям участия в Рекламной игре, перечисленным в п. 5 настоящих Правил.

Участниками Рекламной игры не могут быть работники Организатора Рекламной игры, родственники и члены их семей, члены комиссии по проведению данной Рекламной игры, родственники и члены их семей.

Консультанты — совершеннолетние дееспособные граждане Республики Беларусь и лица, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, и внесенные в Базу покупателей продукции Организатора. Информация о каждом Консультанте, приведенном Участником Рекламной игры, вносится в Базу покупателей продукции Организатора в сведения о соответствующем Участнике Рекламной игры.

Каталог — перечень продукции, реализуемой Организатором Рекламной игры в предусмотренный каталогом период времени. Каталог продукции Организатора может быть получен в Сервисном Центре Организатора Рекламной игры (далее — **«Сервисный Центр»**), расположенном по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, 220073, ул. Скрыганова, д. 6 (далее — **«Каталог»**).

Балл бонуса — количественная величина, присваиваемая каждой единице продукции ИООО «Орифлэйм Косметикс», отражаемая в Приложении к Каталогу Организатора Рекламной игры, действующему на момент приобретения продукции Организатора. Приложение к Каталогу продукции ИООО «Орифлэйм Косметикс» может быть получено в Сервисном Центре Организатора Рекламной игры.

4. Призовой фонд Рекламной игры

Призовой фонд Рекламной игры составляет:

Приз 18 000 000 (восемнадцать миллионов) белорусских рублей.

5. Условия участия в Рекламной игре

Для участия в Рекламной игре, проводимой в соответствии с настоящими Правилами, Участнику Рекламной игры необходимо выполнить следующие условия:

• В период с 4 января 2007 г. по 25 января 2007 г. привести в ИООО «Орифлэйм Косметикс» 2 (двух) и более Консультантов, каждый из которых должен приобрести в течение 21 дня с момента регистрации продукцию из Каталога продукции Организатора, действующего на момент приобретения продукции, стоимостью, соответствующей не менее чем 100 (сто) Баллам бонуса.

• В период с 16 февраля 2007 г. по 23 февраля 2007 г. из Базы покупателей продукции Организатора будут выбраны 50 участников Рекламной игры, которые привели в ИООО «Орифлэйм Косметикс» наибольшее количество Консультантов, выполнивших вышеуказанные условия.

• При равном количестве Консультантов у участников Рекламной игры лучшим считается тот участник, у кого имеется наибольший % новых покупателей от ЛГП, заключивших договор купли-продажи с ИООО «Орифлэйм Косметикс» и приобретших продукцию из Каталога продукции Организатора за период со 2 января 2007 г. по 25 января 2007 г.

• В период с 16 февраля 2007 г. по 23 февраля 2007 г. список пятидесяти выбранных участников Рекламной игры будет представлен для ознакомления на информационном стенде Сервисного Центра Организатора Рекламной игры по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, 220073, ул. Скрыганова, д. 6, комнаты 2201 и 2202 и каждому из пятидесяти выбранных участников Рекламной игры будет направлено заказное письмо с вложенным купоном Участника Рекламной игры. Участники заполняют полученные ими купоны шариковой ручкой, указав следующие сведения о себе: фамилию, имя, отчество, адрес прописки с индексом, паспортные данные, контактный телефон, индивидуальный регистрационный номер Участника. Индивидуальный регистрационный номер присваивается каждому покупателю продукции Организатора и сообщается при заключении первого договора купли-продажи с Организатором.

• Заполненный купон необходимо опустить в ящик для купонов в Сервисном Центре либо отправить по почте до 3 марта 2007 г. (определяется по почтовому штемпелю получения) по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, 220073, ул. Скрыганова, д. 6, комната 2201, для ИООО «Орифлэйм Косметикс». Купоны, заполненные неразборчиво, неправильно, частично не заполненные, с исправлениями и (или) подчистками, полученные позже указанного срока, к участию в розыгрыше не допускаются.

6. Регламент деятельности комиссии по проведению Рекламной игры

В целях контроля над объективным проведением Рекламной игры и определения победителей создается комиссия по проведению рекламной игры (далее — **«Комиссия»**). Комиссия состоит из 4 (четырех) человек.

Состав комиссии утверждается приказом И.о. Директора ИООО «Орифлэйм Косметикс». Заседание Комиссии является правомочным при участии в нем большинства членов ее зарегистрированного состава. Решения Комиссии оформляются протоколом, который подписывается всеми присутствующими на заседании членами Комиссии.

В компетенцию Комиссии входит: контроль за правильностью проведения Рекламной игры, включая порядок выдачи призов; определение и объявление победителей Рекламной игры; рассмотрение возникших споров при проведении Рекламной игры и розыгрыше призового фонда.

Заседание комиссии проводится по мере необходимости по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, 220073, ул. Скрыганова, д. 6, блок 4, комната 2201, телефон для справок:
(017) 256-18-35, ИООО «Орифлэйм Косметикс».

7. Место, дата, время и порядок розыгрыша призового фонда

Розыгрыш приза состоится 07 марта 2007 г. в 15.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, 220002, ул. Сторожевская, д.15, гостиница «Беларусь» (конференц-зал).

Победитель Рекламной игры определяется в следующем порядке:

Члены Комиссии помещают все заполненные купоны в лототрон (лототрон представляет собой прозрачный контейнер, в который помещаются все участвующие в розыгрыше купоны). Член Комиссии в присутствии остальных членов Комиссии запускает лототрон. Лототрон останавливается автоматически, и один из членов Комиссии, в присутствии всех остальных членов Комиссии, наугад достает из лототрона один купон и объявляет имя победителя.

Приз вручается победителю в период с 8 марта 2007 г. по 17 марта 2007 г: по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, 220073, ул. Скрыганова, д. 6, блок 4, комната 2201, телефон для справок: (017) 256-18-35, ИООО «Орифлэйм Косметикс».

Организатор уведомляет победителя о результатах розыгрыша, месте, порядке и сроке выдачи приза путем направления заказного письма по адресу, указанному в купоне победителя Рекламной игры.

Для получения приза необходимо иметь паспорт либо документ, который в соответствии с законодательством Республики Беларусь заменяет паспорт (например, вид на жительство для лиц без гражданства). Приз выдается победителю лично. Если до 18 марта 2007 г. победитель Рекламной игры, уведомленный Организатором Рекламной игры о месте, порядке и сроке выдачи приза заказным письмом, не обратится за получением соответствующего приза, приз остается у Организатора Рекламной игры. Приз выдается только при условии внесения победителем в кассу Организатора подоходного налога в сумме, рассчитанной в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь от суммы призового фонда. В случае отказа победителя внести подоходный налог приз остается у Организатора Рекламной игры.

Результаты розыгрыша приза подлежат публикации в газете «Комсомольская правда» в Белоруссии» в период с 8 марта 2007 г. по 14 марта 2007 г.

8. Особые условия Рекламной игры

Продукция Организатора, реализуемая в рамках настоящей Рекламной игры, соответствует обязательным требованиям законодательства Республики Беларусь, предъявляемым к качеству соответствующего товара.

Ответственность Организатора по выдаче приза ограничивается исключительно вышеуказанными призами.

Организатор не производит выплату денежного эквивалента стоимости приза.

Победители соглашаются, что его имя, фамилия, фотографии могут быть использованы Организатором в рекламных целях на территории Республики Беларусь в печатных, аудио- и видеоматериалах, в глобальной сети Интернет в рамках данной Рекламной игры.

Обязательства по выплате подоходного налога в соответствии с законодательством Республики Беларусь в связи с получением приза полностью возлагаются на победителей.

Организатор не вступает в споры между участниками по определению фактического лица, получающего приз.

Факт участия в данной игре означает ознакомление и полное согласие участников с настоящими Правилами Рекламной игры.

СОСТАВ КОМИССИИ
ПО ПРОВЕДЕНИЮ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ОТКРОЙТЕ МОДНЫЙ СЕЗОН»

Комиссия по проведению рекламной игры «ОТКРОЙТЕ МОДНЫЙ СЕЗОН» создается в целях контроля над объективным проведением Рекламной игры и определения победителя и состоит из 4 (четырех) человек:

СВЕДЕНИЯ О РАЗМЕРЕ, СОСТАВЕ И ПОРЯДКЕ ФОРМИРОВАНИЯ ПРИЗОВОГО

Фамилия Имя Отчество	Место работы
1. Новикова Ирина Эдуардовна	Менеджер административно-хозяйственного сектора Иностранного общества с ограниченной ответственностью «Орифлэйм Косметикс» Срок полномочий: С 04.01.2007 г. по 07.03.2007 г.
2. Ватман Елена Владимировна	Специалист по маркетингу и продвижению продаж I категории сектора маркетинга и продвижения продаж Иностранного общества с ограниченной ответственностью «Орифлэйм Косметикс» Срок полномочий: С 04.01.2007 г. по 07.03.2007 г.
3. Астафьева Ирина Ивановна	Председатель Общественного объединения «Минское общество потребителей» Срок полномочий: С 04.01.2007 г. по 07.03.2007 г.
4. Герасимов Николай Валерианович	Директор Иностранного общества с ограниченной ответственностью «Орифлэйм Косметикс» Срок полномочий: С 04.01.2007 г. по 07.03.2007 г.

ФОНДА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ОТКРОЙТЕ МОДНЫЙ СЕЗОН»

Размер призового фонда рекламной игры «ОТКРОЙТЕ МОДНЫЙ СЕЗОН» составляет 18 000 000 *(восемнадцать миллионов)* белорусских рублей. Призовой фонд рекламной игры «ОТКРОЙТЕ МОДНЫЙ СЕЗОН» сформирован за счет чистой прибыли Организатора — Иностранного общества с ограниченной ответственностью «Орифлэйм Косметикс».

В состав призового фонда входит:

Приз 18 000 000 (восемнадцать миллионов) белорусских рублей.

Свидетельство о государственной регистрации правил проведения рекламной игры № 607 от 30 декабря 2006. Выдано Министерством торговли РБ.

НОВЫ ГОД ДЗЯЦІНСТВА

Як вы ў дзяцінстве сустракалі Новы год? Што вам больш за ўсё падабалася? Якія традыцыі з дзяцінства вы перанеслі ў дарослае жыццё?

Андрэй ТУР, намеснік міністра эканомікі Беларусі:

— Самае яскравае ўражанне ад Новага года ў дзяцінстве — гэта бацькі, якія падкладвалі пад ёлку нейкі падарунак. І гэтае ўражанне было звязана з Дзедам Марозам. Напэўна, як вынік, у маім уласным доме заўсёды ёсць і будзе, пакуль я жывы, вельмі высокая «сапраўдная» ёлка, упрыгожаная рознакаляровымі цацкамі.

Новы год традыцыйна быў хатнім святам. І я заўсёды сустракаў і буду сустракаць яго толькі ў сваёй сям'і. Больш цёплага (нягледзячы на маразы), больш жыццесцвярджальнага свята, напэўна, няма. Свята, калі чакаеш самага лепшага, выканання жаданняў.

Я нарадзіўся і першыя сем гадоў жыў у Ленінградзе. У Юсупаўскім садзе стаяў велізарны, гіганцкі (мабыць, я проста маленькі быў і ён мне такім здаваўся) ледзяны слон, на якім я катаўся. У Беларусі ўсе першыя гады майго жыцця былі вельмі снежныя. Толькі апошнія гады не было снегу.

На навагоднія ранішнікі ў школу я хадзіў, але традыцыйна больш назіраў за тым, што адбывалася, чым удзельнічаў. Маці і тата майго школьнага сябра (з якім я 10 гадоў прасядзеў за адной партай) былі акцёрамі, і мы часта хадзілі на іншыя навагоднія паказы. Напрыклад, у Палац спорту. Там мы таксама былі гледачамі.

Уладзімір ГРАЎЦОЎ, генеральны дырэктар Агенцтва Уладзіміра Граўцова, дацэнт факультэта журналістыкі БДУ:

— Маё дзяцінства прайшло ў маленькай вёсцы ў Магілёўскай вобласці, і самае моцнае ўражанне засталося ад таго, што мая сям'я кожны Новы год атрымлівала пасылку (звычайна з апельсінамі) ад бабулі, якая жыла ў горадзе. Мы гэтыя апельсіны цэлы год чакалі.

Што не падабалася на Новы год? Было дзіўнае ўражанне, што эпіцэнтр «свята жыцця» знаходзіцца недзе далёка. Там, дзе знаходзіцца тэлевежа. Але ў памылковасці гэтага ўражання я пераканаўся, калі потым пасяліўся побач з гэтай тэлевежай.

У вёсцы я з татам ішоў у лес, правальваючыся па калена ў снезе, і мы выбіралі там елку. І ў мяне сёння такое ўражанне, што ў часы майго дзяцінства снегу было значна больш, чым зараз. Раней нават дзверы дома часам было цяжка адчыніць... Ёлка і велізарныя гурбы снегу — вось мае ўражанні ад зімы ў дзяцінстве.

ЗЮЗЯ ПРОСІЦЬ ЗА ЗІМУ

Цудоўна ўладкаваўся Зюзя Паазерскі ў сваёй лясной сядзібе на Пастаўшчыне. Хата, зрубленая са звонкіх сасновых бярвенняў, глядзіцца як лялечка. Кругом цішыня і спакой, да людскога жылля не так і блізка. Ніхто не назаляе на працягу года. Ну а з надыходам зімы, Калядаў і навагодніх святаў ён рады прыняць усіх гасцей, сустрэць іх шчыра і праводзіць з добрым настроем. Адно засмучае Зюзю — зіма яшчэ за гарамі. На

календары снежань — а снегу ані кропелькі. Капяжы і дожджыкі на абшарах яму падуладных. Яшчэ раз агледзіць Зюзя свае ўладанні. Ад Браслаўскіх азёраў на поўначы да Нарачанскіх на поўдні, ад славутага і таямнічага бяздоннага возера Балдук на захадзе і азёр Глыбоцкіх на ўсходзе — паўсюль непрыбраныя снежнаю коўдрай палі, незамерзлая гладзь азёрнай вады, паселішчы людскія цёмнымі стрэхамі глядзяць у неба. Непарадак.

А ён жа на працягу стагоддзяў у беларускай міфалогіі быў увасабленнем холаду. Яго ўяўлялі і ўяўляюць дзядуляй з доўгімі белымі валасамі, белай барадой. Ён павінен узнімаць завіруху, замятаць і засыпаць усё снегам. І студзіць, студзіць, студзіць. Нездарма ж у народзе ў зімовы час гаварылі: «Змерз, як Зюзя.» А калі бывалі моцныя маразы і трашчалі дрэвы ў лясах і бярвенне ў хатах — лічылася, што гэта Зюзя б'е па іх доўбняй. І па вёсках як цяпер ісці, як папярэджваць вяскоўцаў пра суровую зіму, дапамагаць халодным? Цёпла ў наваколлі.

Вось і просіць Зюзя за зіму, просіць снегу на палі, каб вырас добры ўраджай, просіць лёгкіх, але здаровых маразоў, каб бавіліся на зімовым улонні дзеці і дарослыя. А ў хаты ён абавязкова завітае, павіншаваць са святам, пачаставацца куццёй. Нездарма гавораць: «Зюзя на двары — куцця на стале.»

Вароты лясной сядзібы вартуюць у Зюзі Лесавікі-Палявікі. А ў хаце-цераме дапамагаюць Чараўніца Зіма, ліхая Баба Напасць, Жыжаль, іншыя персанажы беларускай міфалогіі. І ўсе яны чакаюць снегу, сапраўднай зімы, але найбольш чакаюць гасцей і тых, хто пабываў тут у мінулыя святы і застаўся вельмі задаволеным, і новых — з усёй Беларусі...

Калі аўтары і арганізатары праекта — райвыканкам, цэнтр турыстычных паслуг, лясгас, іншыя арганізацыі выбіралі месца для сядзібы Зюзі, увагу іх прыцягнуў невялікі лес у раёне вёскі Пруднікі. Зусім недалёка ад асфальтаванай шашы, і ў той жа час даволі ціхі, малазаселены куток. Справа ў тым, што тут некалі знаходзіўся палігон ваенна-паветраных сіл. І гэта ў нечым сімвалічна. Мясціна, дзе некалі гулі самалёты, чуліся стрэлы, стала настолькі ціхай, што тут змог пасяліцца герой беларускай міфалогіі. Значыць, і ўвогуле цішэе на нашай зямлі. Мірнае сіняе над ёй неба.

Прыехаўшы ў госці да Зюзі Паазерскага, нельга абмінуць Паставы. Своеасаблівай візітнай карткай горада з'яўляецца цэнтральная плошча, дзе аснову аблічча ствараюць дамы Тызенгаўза, помнікі барочнай архітэктуры. Тут можна пазнаёміцца з палацам Тызенгаўзаў, пабываць у Святамікалаеўскай царкве, касцёле С. Антонія Падуанскага, у якім убачыць традыцыйную калядную шопку (яслі). У Доме рамёстваў «Стары млын» можна не толькі ўбачыць, як захоўваюцца традыцыі народнай творчасці, але і паўдзельнічаць у святочнай латарэі «Кожны квіток — шчаслівы».

Недалёка ад сядзібы Зюзі Паазерскага комплекс «Салаўіны гай», дзе на арыгінальна аформленай тэрыторыі знаходзяцца адкрытыя вальеры са страусамі, аленямі, трусамі...

А на сядзібе Зюзі сустракае сам гаспадар, які і зімою ходзіць босы, славіцца сваёй дабрынёй да людзей, ласкаю да дзяцей. Тут і гульні, і карагоды, конкурсы, адгадванне загадак, разнастайныя сувеніры. І абавязкова ж — святочны феерверк. Тут жа, у майстэрні ганчара Сяргея Шчэрбы, можна паспрабаваць самастойна зрабіць цацку альбо збанок, прыдбаць сабе падарунак на свята.

Увогуле гандаль ля сядзібы Зюзі Паазерскага шчыруе. Запрашае карчма «Ласункі ад Зюзі», прапануецца духмяная гарбата на зёлках, выстава-продаж «Паазерскія забаўкі». А для дарослых — «Чарка, скварка і салёны агурок». Сама імпрэза цягнецца недзе гадзіны дзве, але ўражанняў і сапраўднага задавальнення хапае, асабліва дзецям.

І некалькі бліц-інтэрв'ю.

Ягор ШУШКЕВІЧ, дырэктар цэнтра турыстычных паслуг у Паставах: «Думаю, наш, хоць і невялікі, вопыт паказвае, што з'яўленне на Пастаўшчыне Зюзі Паазерскага ў дадатак да Дзеда Мароза ў Белавежскай пушчы не стала простa прыдумкай, і ніяк не носіць налёту штучнасці. У мінулыя святы праз турыстычныя фірмы на яго сядзібе штодзень бывала да 40—45 чалавек. Сёлета больш гасцей, прымаем да ста ў дзень. Брама на сядзібу Зюзі Паазерскага пачала расчыняцца ўжо 22 снежня і чакае гасцей да 15 студзеня. Відовішчы на сядзібе арганізуюцца ў 14, 16, 18 гадзін. Апошняе, зразумела, ужо толькі для дарослых.»

Андрэй КЛЯНТАК, жыхар Пастаў: «У мінулы раз патрапіў на гэта цікавае відовішча, можна сказаць, выпадкова. Вырашыў паехаць разам з дачкой, паглядзець, што там новае адчынілася. І вельмі спадабалася, а дачка дык патрапіла ў сапраўдную казку. Так што сёлета мы тут — усёй сям'ёй».

Зюзя ПААЗЕРСКІ: «Упадабаў я гэтыя мясціны адразу. Утульна мне тут, на працягу года добра адпачываць, ну а прыйдзе свята — папрацаваць. Люблю дзятву парадаваць, дарослым дагадзіць. І ў карагодзе босым ля ёлкі пахадзіць. Ды тым, хто часам кажа, «п'яны я, нібы Зюзя», адпор даю адразу, я з імі не ў саюзе. Бо чарачка без меры — і весялосць праз дзверы. Святкуйце ж, не журыцеся. Са шчасцейкам бярыцеся!»

На сядзібе Зюзі Паазерскага пабываў Алесь КАСЦЕНЬ.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.27	16.01	7.34
Віцебск —	8.24	15.44	7.20
Магілёў —	8.17	15.52	7.35
Гомель —	8.06	15.56	7.50
Гродна —	8.41	16.18	7.37
Брэст —	8.33	16.27	7.54

Месяц

Поўня.

Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Настассі, Дзмітрыя, Фёдара.*

К. *Альжбеты, Ангелікі, Анелі, Рыгора, Тытуса, Яўгенія.*

Надвор'е на заўтра



…у суседзяў

ВАРШАВА	+5 — +7 °C	МАСКВА	-2 — 0 °C, без ападкаў
ВІЛЬНЮС	+2 — +4 °C	РЫГА	+3 — +5 °C
КІЕЎ	+1 — +3 °C, без ападкаў	С-ПЕЦЯРБУРГ	0 — +2 °C

Дзве даты

4 студзеня

1015 гадоў таму (992 год) заснавана Полацкая праваслаўная епархія, старэйшая хрысціянская епархія ў Беларусі (як адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка Кіеўскай мітраполіі). Кафедральным храмам стаў Полацкі Сафійскі сабор. У 1511 годзе епархія атрымала статус архіепіскапіі, што сведчыла аб яе высокім духоўным аўтарытэце.

1643 год — нарадзіўся Ісак Ньютан, англійскі фізік, астраном, механік.

Цытата дня:

«Не той багаты, хто адлічвае грошы, каб схаваць іх у сундук, а той, хто адлічвае ў сябе лішняе, каб дапамагчы таму, у каго няма патрэбнага».

Дзяніс Іванавіч Фанвізін (1745—1792), рускі пісьменнік.

БЕЛИНВЕСТБАНК

В СВЯЗИ С ОПТИМИЗАЦИЕЙ СЕТИ

КОМИССИЯ ОБЪЯВЛЯЕТ

о закрытии со 02.02.2007 года Октябрьского отделения в г. Гродно ОАО "Белинвестбанк", код 709 (г. Гродно, ул. Сов. пограничников, 110) и создании на его базе отделения № 201 головного филиала по Гродненской области, код 705 (г. Гродно, ул. Сов. пограничников, 110).

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА НА АУКЦИОНЕ

ЗАО «ВЦ» АКВАБЕЛ» Минский район проводит открытый аукцион по продаже объекта недвижимого имущества:

№ лота	Наименование объекта недвижимости	Общая площадь, м кв.	Начальная цена с НДС, бел.руб.	Адрес объекта
1	Ангар арочный	1151,1	463 157 143	Минский район, район д. Королев Стан

Задаток в размере 10% от стоимости лота перечисляется на р/с № 3012204960010 в филиале ОАО «Белагропромбанка» МГД г.Минск, ул. Ольшевского 24, код 963, УНН 600438617, ОКПО 28976346, ЗАО «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район. Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 10 дней от даты подписания протокола о результатах аукциона. Аукцион состоится 12 января 2007 г. в 11.00 по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и МКАД, Административное здание, отдел коммерческой недвижимости. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 11.01.2007 г. до 17.30 по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и МКАД, Административное здание, отдел коммерческой недвижимости.

Контактный телефон: (8-017) 237-93-93.

У АБАРАЧЭННІ — НОВЫЯ МАНЕТЫ

Нацыянальны банк у рамках міжнароднай манетнай праграмы выпусціў у абарачэнне памятныя манеты «Алімпійскія гульні 2008 года. Лёгкая атлетыка», а таксама ўвёў у абарачэнне манеты «Веласпорт» і «Дуга Струвэ», паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар галоўнага банка краіны Міхаіл Журавовіч.

Манеты «Алімпійскія гульні 2008 года. Лёгкая атлетыка» — сярэбраныя і маюць намінал 20 і 1000 рублёў. Першая манета пробай сплаву 925 і масай 28,28 г выпускаецца тыражом 20 000 штук, другая — пробай сплаву 999 і масай 1000,00 г мае тыраж да 1500 штук. Гэтыя манеты адчаканены якасцю «пруф». Сярэбраныя памятныя манеты «Веласпорт» наміналам 20 рублёў адчаканены якасцю «пруф» тыражом 5000 штук. Медна-нікелевыя манеты «Веласпорт» наміналам 1 рубель адчаканены якасцю «пруф-лайк» таксама тыражом 5000 штук. Манеты «Дуга-струвэ», як і папярэдняя, выходзяць у свет наміналамі 20 і 1 рубель, яны адпаведна сярэбраныя і медна-нікелевыя. Тыраж кожнай складае па 5000 штук.

Ігар ГРЫШЫН.

«ЗЯЦЁК, ПАД'ЯЗДЖАЮ, СУСТРАКАЙ!»

або Пільнуйце дакументы і гасцей

Роўна два гады таму ў першы дзень новага года я ехала ранняй электрычкай «Брэст—Мінск». Вагон быў амаль пусты. Неабходнасць ехаць у такі час, калі людзі толькі заканчваюць святочныя вечарынкі, у сукупнасці з некаторымі іншымі абставінамі стваралі настрой філасофска-меланхалічны. Але парушылі яго дзве вясковыя бабулькі, што зайшлі ў вагон недзе недалёка ад Івацэвічаў. Жанчыны гадоў пад семдзесят, апранутыя па-святочнаму, выглядалі надзвычай бадзёра і жыццярадасна. Не паспелі кабеты ўсесціся, як пачалі наперабой дзяліцца ўражаннямі ад сустрэчы Новага года. З гэтай вясёлай гамонкі стала ясна, што сельскія жыхаркі — даўно ўдовы, але святочным вечарам павесяліліся ў добрай кампаніі, а ранкам выбраліся ў госці. Заўважу, што два гады таму мабільныя тэлефоны не былі такой масавай з'явай, як цяпер.

І калі падчас гуллівай гамонкі ранніх пасажырак у сумцы адной з іх нешта гучна затрашчала, я падумала: «З будзільнікам яна хіба ездзіць?». Але бабуля хуценька выцягнула з рыдыкюля, пэўна, яшчэ сваёй маладосці сіні апарат памерам ледзь не з цагліну і гучна загаварыла ў яго: «А, зяцёк, пад'язджаю, сустракай!».

Адразу радасна зрабілася за гэтых незнаёмых бабулек. Толькі ў амерыканскіх ці французскіх раманах можна сустрэць апісанне, як весела і змястоўна могуць адпачываць іх пенсіянеркі разам са сваімі бой-фрэндамі. А вось ці змаглі б яны карову дагледзець, свіней, курэй накарміць, а потым пайсці на гулянку, вялікае пытанне.

У нас жа чамусьці лічыцца, што святочныя вечарынкі — забавы маладых. Яно, вядома, у маладосці бывае больш прыгод, больш рамантыкі. Да гэтай пары памятаецца навагодняя ноч у інтэрнаце на вуліцы Кастрычніцкай, у якім пражылі студэнцкія гады большасць журналістаў краіны. Адзін з кавалераў таго застолля быў крыху баязлівым занудам, да таго ж ён ужо скончыў універсітэт і ў ім жа працаваў. Ну і асабліва завадныя дзяўчаты дамовіліся «раскруціць» яго. Але самае большае, што пачула наша каляжанка, якой даручылі тую асабліву місію: «Жанна, у тебя юбка короче, чем необходимо». Потым гэту фразу мы ўспаміналі доўга. А тады ён сышоў адным з першых на свой другі паверх. Пайшоў хутка, нават куртку не захапіў. І ўжо каб зусім пасмяяцца з небаракі, адна з нашых выйшла на лесвічны пралёт і закрычала, што ёсць моцы з восьмага паверха ўніз: «...скі», ты сваю адзежу забыў». Трэба было бачыць, як ён усхваляваўся: «Ну зачем она называет мою фамилию?!».

Але ж, дзякаваць Богу, на кар'еру маладога вучонага той выпадак ніякага ўплыву не меў, зараз ён прафесар аднаго з самых прэстыжных факультэтаў. А вось другі госць, дарэчы зусім выпадковы, мог бы паплаціцца паслужным спісам. Бо таварыш той, на тры гады старэйшы, служыў у войску пад Мінскам. На свята атрымаў звальненне і завітаў у родны інтэрнат. Да нас зайшоў, хутчэй, з візітам ветлівасці. Пасядзеў колькі мінут, выпіў глыток шампанскага ды падаўся далей. Ніхто адразу і не заўважыў, што хлопец пакінуў на спінцы крэсла пінжак. А ён так нагасцяваўся за ноч, што не памятаў, у якія пакоі заходзіў. Але працверазненне назаўтра здарылася хутка, бо ў пінжаку ляжаў партыйны білет. Людзі старэйшага пакалення ведаюць, што значыла страта названага дакумента. Мы з цяжкасцю знайшлі яго самі, аддалі тую адзежыну. Варта было паглядзець на радасць чалавека, пачуць удзячныя воклічы і абяцанні скрыню шампанскага. Праўда, скрынка аказалася віртуальнай. Але ж нічога, галоўнае, што чалавек і ў сталіцы, і пры пасадзе, і выпадак той зараз успамінаецца са смехам.

А адноўчы я ўбачыла, што такое качацца са смеху ў прамым сэнсе. І не толькі ўбачыла. Таксама на Новы год. Усе суседзі на нашай пляцоўцы людзі добрыя. Але адзін, палкоўнік у адстаўцы, усеагульны любімец. Пра людзей такога кшталту звычайна ўзнімаюць вялікі палец і кажуць: «Во такі мужык». А ўжо гасцінны, прыветлівы, — пашукаць. Яшчэ Андрэевіч, так яго ўсе называюць, адрозніваецца актыўнай жыццёвай і палітычнай пазіцыяй. Калі ж возьме сто грамаў, пазіцыя становіцца яшчэ больш актыўнай, як аказалася. Мы з другой суседкай Любай раз-пораз бегалі адна да аднае, абменьваліся рэцэптамі салатаў, прыбіралі лесвічную пляцоўку. І сталі сведкамі, як да Андрэевіча завіталі госці, як ён сустракаў-прывячаў, з абдымкамі, пацалункамі, з радасцю непрыхаванай. Прыйшлі яны, помніцца, рана, яшчэ далёка да цемнаты. А год наступаў 97-мы, акурат пасля рэферэндуму. І трэба ж было такому здарыцца, што пазіцыі гаспадара і гасцей па некаторых пунктах унутранай палітыкі, мякка кажучы, не супалі. З чаго пачалася размова, невядома, але абярнулася такой гарачай спрэчкай, што забыліся ўсе на свята. І што вы думаеце? Выправіў гаспадар сваіх гасцей, ды такімі словамі, якіх мы з суседкай ад сталага і шаноўнага Андрэевіча за ўвесь час не чулі. Калі іх перакласці на друкаваную мову, будзе прыкладна так: «Ідзіце к чорту».

Вось тады мы з Любай і ўпалі на падлозе ў маёй кватэры і літаральна качаліся са смеху.

Так што пакідайце дакументы ў шафе, высвятляйце палітычныя погляды сваіх гасцей загадзя, а яшчэ лепш, як піша адзін з маіх любімых расійскіх газетчыкаў: «Бывайце здаровыя і трымайце сябе ў руках».

Святлана ЯСКЕВІЧ.

У новым годзе — новыя станцыі метро, новыя аўтобусы

У «Дзень горада «Мінск-2007» плануецца адкрыццё двух новых станцый першай лініі метрапалітэна — «Барысаўскі тракт» і «Уручча» (працягласцю 2,7 кіламетра). Для захавання існуючага інтэрвалу руху будуць закуплены чатыры новыя саставы. Дарэчы, 2007 год — юбілейны для сталічнай падземкі, у маі споўніцца 30 гадоў з часу пачатку яго будаўніцтва ў беларускай сталіцы.

Запланавана таксама будаўніцтва тралейбуснай лініі па вул. Гарэцкага і вул. Лабанка — ад вул. Рафіева да вул. Адзінцова, каб палепшыць транспартныя зносіны жыхароў буйнога жылога раёна «Малінаўка» са станцыямі метрапалітэна.

У цэлым па краіне запланавана набыццё 821 аўтобуса. Мінтрансам будзе распрацавана цэнтралізаваная сістэма продажу білетаў на праезд у пасажырскім транспарце. Гэта дазволіць, ужо пачынаючы з 2008 года, прадаставіць дадатковыя паслугі насельніцтву па набыццю за наяўны і безнаяўны разлікі ў касах пасажырскіх тэрміналаў білетаў на аўтобусы, якія адпраўляюцца з іншых аўтаваказалаў, на цягнікі і самалёты, а таксама набываць аўтобусныя білеты праз інфакіёскі. Укараненне такой сістэмы, упэўнены яе распрацоўшчыкі, дасць значную сацыяльную і эканамічную эфектыўнасць за кошт набліжэння паслугі да пасажыра, прадастаўлення дадатковага сэрвісу і забеспячэння прынцыпу «аднаго акна».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Святочнае застолле для дзікоў

У Магілёўскім заасадзе, што ў пасёлку Буйнічы Магілёўскага раёна, асабліва звярнулі ўвагу адміністрацыі і наведвальнікаў цяпер карыстаюцца дзікі. Натуральна, што звязана гэта з новым годам, які, паводле ўсходняга календара, з'яўляецца годам Чырвонага Кабана.

Вальер, дзе жывуць дзве сем'і дзікоў, упрыгожаны па-святочнаму. Прама пад шыльдай «Небяспечная жывёла» павесілі калядны вянок. «Альтанкі», дзе дзікі ядуць і ляжаць, абвешаныя яловымі лапкамі і бліскучылі гірляндамі. Цяпер, у святы, дзікоў частуюць асабліва багата: кукурузай, жалудамі і морквай.

Дзікі ў заасадзе — адкормленыя, чыстыя і здаровыя. Відаць, наеліся яны ўжо ўдосталь, таму спрабуюць легчы адпачываць, адзін да аднаго — гуртом.

Лідар у гэтай кампаніі — дзік Канстанцін. Гэта буйная жывёліна, якая не лянуецца падскочыць да сеткі і прадэманстраваць прысутным, хто тут сапраўдны гаспадар тэрыторыі. А калісьці, расказвае дырэктар Буйніцкага агралесатэхнічнага каледжа Георгій Маліноўскі, Канстанціна забралі з адной паляўнічай гаспадаркі худога і хворага, ён не мог падняцца на ногі. Але яго выхадзілі і выкармілі, і цяпер дзік — грозная і прыгожая жывёліна.

У вялікім вальеры, амаль на волі, жыве больш за паўсотню дзікоў. Іх можна пабачыць на пешаходнай сцежцы ўвечары, калі яны прыходзяць на падкормку.

Наведвальнікі заасаду цяпер адразу бягуць да дзікоў і спрабуюць іх фатаграфаваць, заклікаючы да сябе жывёлін гучнымі крыкамі «кыс-кыс». Але дзікі — незалежныя, пазіраваць яны не хочуць, і ў большай частцы дэманструюць свае, прабачце, заднія часці. Аднак гэта не лічыцца дрэннай прыкметай на гэты год: людзі з павагай ставяцца да нораву і звычак сімвала новага 2007 года.

А ў заасадзе цяпер падводзяць вынікі ўжо мінулага года. Зусім нядаўна тут з'явілася сімпатычнае медзведзяня Федзька. Гэта падарунак прэм'ер-міністра Карэліі пасля яго візіту ў Магілёў. Федзьку цяпер 1 год і 8 месяцаў, ён хутка расце і будзе важыць да 300 кілаграмаў! А пакуль медзведзяня як дзіця актыўна гуляецца і за кароткі час стаў любімцам публікі. Галоўная забава Федзькі — ляпіць снежкі (калі ёсць з чаго ляпіць) і кідацца імі ў людзей. У Петразаводску паабяцалі падарыць Магілёўскаму заасаду яшчэ двух паўночных аленяў, якія паедуць у запрэжцы з Дзедам Марозам. А таксама заацэнтр сталіцы Карэліі прапанаваў магілёўскім калегам сумесную праграму для лячэння нервовых захворванняў людзей праз зносіны з дзікімі жывёламі.

Летась у заасадзе працягвалі сваю асноўную працу: ратавалі жывёл з розных куткоў Беларусі, якія трапілі ў крытычныя сітуацыі. Зусім выраслі казулі Дашка і Боні, якіх улетку выкормлівалі малаком з соскі. Гэтых казулянят знайшлі паблізу Рэчыцы, без маці яны былі асуджаны памерці ў лесе. Падрастае лось Лёнька, якога забралі з вясковага свінарніка, куды з адчаю прыбілася хворая жывёліна.

У гэтым годзе заасад будзе пашырацца: у куткім часе там адкрыецца кафэ, зробяць сажалку, рыхтуецца праект мясцовай чыгункі для экскурсій і прыстанку для рачных трамваяў.

— Ад імя супрацоўнікаў заасаду, а таксама нашых дзікоў і ўсіх жывёлін, жадаю, каб у новым годзе людзі бераглі дзікую жывую прыроду, — гаворыць Георгій Маліноўскі. — У свеце цяпер цяжка знайсці куточак, куды б не дабраўся навукова-тэхнічны прагрэс. Таму трэба падумаць і аб дзікіх жывёлах. Памятаць, што яны маюць такое ж права на жыццё, як і мы, людзі. І мы адказныя за нашых братоў меншых.

Ілона ІВАНОВА.

Суд Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці ў сувязі з паступіўшай заявай аб прызнанні адсутным без вестак **Олендра Эдуарда Станіслававіча,** 24.09.1952 года нараджэння, ураджэнца горада Ваўкавыска Гродзенскай вобласці, які ў 2003 г. выехаў на заробкі ў г. Маскву, просіць усіх грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра ўказанага грамадзяніна, паведаміць іх суду на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.
html: www.zvyazda.minsk.by **E-mail:** info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 36.891. Індэкс 63850. Зак. № 42. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12